Hod VIII. Sakavik 1936 h. № 3.

Шлях Моладзі
Šlach Moładzi

…„Падымайся з нізін, сакаліна сям'я,
Над крыжамі бацькоў, над нягодамі!
Занімай, Беларусь маладая мая,
Свой пачэсны пасад між народамі."
ЯНКА КУПАЛА.

VILNIA

Biełaruskaja Drukarnia im. Franciška Skaryny — Vilnia, Zavalnaja vul. 1—2.

ЗЬМЕСТ № 3:

1. *** — М. Машара; 2. U 18-tyja ŭhodki abvieščańnia Niezaležnaści Biełarusi — J. N.; 3. Deklaracyja pravoŭ maładoha pakaleknia Polščy — j. n.; 4. На родным палетку — Андрэй Чэмер; 5. Вечар беларускай паэзіі і песьні — Я. Н.; 6. А ўсё-ж вярнуся... — М. Танк; 7. Sioletni „Kaziuk" u Vilni; 8. U biełaruskich studentaŭ; 9. Sudy; 10. Chronika; 11. З выдавецкай нівы; 12. Usiačyna; 13. Paštovaja skrynka.

Усіх, хто дагэтуль не аплаціў падпіскі на „Шлях Моладзі" і хоча гэты часапіс далей атрымліваць, просім зараз прысланць нам належныя грошы, бо ў праціўны выпадку высылка „Шл. Мол." ад наступнага нумару будзе ім устрымана.

BIEŁARUSKAJA ABECEDA.

Беларуская абэцэда.

A, a — А, а.	J, j — Й, й.	R, r — Р, р.
B, b — Б, б.	Ja, ja — Я, я.	S, s — С, с
C, c — Ц, ц.	Je, je — Е, е.	Ś, ś — СЬ, сь.
Ć, ć — ЦЬ, ць.	Ju, ju — Ю, ю.	Š, š — Ш, ш.
Č, č — Ч, ч.	K, k — К, к	T, t — Т, т.
D, d, — Д, д.	L, l — ЛЬ, ль.	U, u — У у.
E, e — Э, э.	Ł ł, — Л, л.	Ŭ, ŭ — Ў, ў.
F. f — Ф, ф.	M, m — М, м.	W, w, V, v—В, в.
G, g — Г, г.	N, n — Н, н.	Y, y — Ы, ы.
H, h — Г, г.	Ń, ń — НЬ, нь.	Z, z — З, з.
Ch, ch — Х, х.	O, o — О, о.	Ž, ž — Ж, ж.
I i — І, і.	P, p — П, п.	Ź ź - ЗЬ, зь.

„Шлях Моладзі"

МЕСЯЧНЫ ЧАСАПІС БЕЛАРУСКАЙ МОЛАДЗІ.

Складка на 1 месяц 30 гр.; на 3 месяцы 50 гр., на паўгода— 1 зл., на год - 2 зл.

Заграніцу — ўдвая даражэй.

Адрас Рэдакцыі: Вільня (Wilno), Завальная № 1—2

Рэдакцыя адчынена ад гадз. 9 да 3-яй папаўдні.

Шлях Моладзі

МЕСЯЧНЫ ЧАСАПІС БЕЛАРУСКАЙ МОЛАДЗІ.

Год VIII.	Вільня, Сакавік 1936 г.	№ 3 (89).

Міхась Машара

* * *

(Верш чытаны на Літ. Вечары ў Вільні 15.III.36).

Ідзём туды, дзе волаты
Куюць другія дні.
Калі душою молад ты,
Хутчэй да нас прымкні.

Ідзём шляхамі зорнымі,
У сэрцы сіл прыліў,
І песьняй новай звонім мы
Над шумам родных ніў.

Вітаем напатканыя
І буры, і віхры.
Мы хлопцы гартаваныя
Мы — волі змагары.

У кожнае ваколіцы
Сялянскіх шэрых стрэх —
Расходзіста, задорыста, —
Вясёлы сеем сьмех.

І радасьцю, як сьветачам,
Цярушым доўгі сон.
Нам плакаць болей не па чым —
На ўсходзе новых дзён.

Ідзём туды, дзе волаты,
Куюць другія дні;
Сьцягі нашы разгорнуты,
Ў грудзёх гараць агні.

9.III.1936.

U 18-tyja ŭhodki abvieščańnia Niezaležnaści Biełarusi

Najvialikšym ideałam kožnaha narodu jošć: być u svaim kraju poŭnym haspadarom i ad nikoha niezaležna kiravać svaim žyćciom. Biełaruski Narod vyraziŭ hetkija svaje ideały 25 sakavika 1918 hodu ŭ Miensku, Aktam, jakim Biełaruś była abvieščana Volnaj i Niezaležnaj. U toj adnak čas Narod Biełaruski, pryhniatany doŭhija viaki niavolaj, nia byŭ jašče naležna sarhanizavany i varožyja siły złamali jahonuju volu, staptali najvialikšyja jahonyja ideały i Biełaruś apynułasia jznoŭ u trahična-ciažkim pałažeńni.

Siańnia ad abvieščańnia najvialikšaha biełaruskaha Aktu minuła 18 hadoŭ. Narod Biełaruski žyvie ŭ niadoli, ale ab Akcie 25.III.1918 nie zabyvaje i, łomiačy ŭsie pieraškody, niepieramožna jdzie da Jahonaha ździejśnieńnia.

Bačačy heta našyja vorahi starajucca Akt 25.III.1918 aplavać, panižyć, zakidvajučy jamu roznyja niabylicy. Robiać heta navat časta syny Biełaruskaha Narodu, jakija nia vierać u svaje siły i słuchajuć padšeptaŭ čužyncaŭ. Jany z Aktu 25.III.1918 robiać niejkuju niedarečnuju buržuaznuju štučku. Usio heta jošć niahodnaj i biespadstaŭnaj vydumkaj. Bo-ž sapraŭdy Akt 25.III.1918 vyražaŭ najvialikšyja biełaruskija ideały: Volnašć i Niezaležnašć. Toje-ž, što pamiž najlepšymi synami Biełarusi, abviaščajučymi hety Akt, byli mo' ludzi i nia zusim addanyja Biełaruskamu Narodu, dy što tyja ci inšyja ichnija pastupki ŭ sučasnym razumieńni byli nie taktyčnymi, nia mohuć abnižać samoj vialikaj Idei Aktu 25 III.1918, jakaja jošć čystaj i najvyšejšaj.

Akt 25 sakavika 1918 hodu heta sapraŭdy puciavodnaja zorka ŭ našych imknieńniach i zmahańniach, za katoraj my ŭsie biełarusy pavinny jści i za katoraj idučy dojdziem da śvietłaj mety, kali Biełaruś zajmie „svoj pačesny pasad miž narodami".

Dzień 25-ha sakavika, dzień abvieščańnia Niezaležnaści Biełarusi, heta dzień Biełaruskaha Nacyjanalnaha Śviata. Hety dzień Biełarusy z hodu ŭ hod uračysta śviatkujuć, robiačy adnačasna pierahlad svaich siłaŭ.

Da sioletniaha śviatkavańnia 25 sakavika Biełarusy ŭ Polskaj Dziaržavie padhataŭlalisia zahadzia, bo ŭžo 11.III Biełaruski Nacyjanalny Kamitet u Vilni vydaŭ kamunikat, u jakim zaklikaŭ usich Biełarusaŭ, a prad ŭsim biełaruskija arhanizacyi, naležna ŭšanavać dzień Biełaruskaha Nacyjanalnaha Śviata.

I voś treba śćvierdzić vielmi radasny abjaŭ, što za ładžańnie śviatkavańnia 25 Sakavika sioleta vielmi horača pryniałasia moładź, jak u Vilni, tak i na pravincyi. Asabliva-ž uračysta adbyłosia śviatkavańnia 25-ha Sakavika ŭ Vilni, u biełaruskich skaŭtaŭ. Jany spačatku vysłuchali ŭ Piatnickaj Carkvie malebien za Biełaruski Narod, a paśla nаładzili ŭ pamieškańni 10-taj družyny biełaruskich skaŭtaŭ im. Fr. Bahuševiča ŭračy-

stuju akademiju. Akademiju hetu pačaŭ družynovy Brazoŭski adčytańniem zahadu biełaruskim skaŭtam na dzień 25 sakavika, u katorym było skazana, kab skaŭty, pomniačy ab Vialikim Akcie 25.III.1918, vierna słužyli svajej Baćkaŭščynie i ŭ kožnuju chvilinu byli hatovy ŭ abaronie Jaje addać svajo žyćcio. Paśla hetaha skaŭt U. Karol pračytaŭ referat ab biełaruskich skaŭtach, a hram. Č. Najdziuk — na temu: „Akt 25.III.1918, jak Ideał Biełaruskaha Nacyjanalnaha Adradžeńnia". Pa referatach byli deklamacyi biełaruskich vieršaŭ i vystupaŭ skaŭcki chor. Na zakančeńnie horača pryvitaŭ biełaruskich skaŭtaŭ staršynia Hurtka Pryjacielaŭ Bieł. Skaŭtaŭ Ks. dr. St. Hlakoŭski, jaki zaklikaŭ skaŭckuju moładź być viernaj skaŭckim ideałam—Boh i Baćkaŭščyna, i stojka zmahacca za pravy Biełaruskaha Narodu...

Uračysta tak-ža śviatkavali Biełaruskaje Nacyjanalnaje Śviata vučni Biełaruskaje Himnazii, jakija ŭviečary ŭ himnazijalnaj zali ładzili akademiju, pryśviačanuju Aktu 25.III.1918.

U toj-ža čas, kali adbyvałasia śviatkavalnaja akademija biełaruskich vučniaŭ, a hadz. 20 min. 30, pačynałasia śviatkavańnie Biełaruskaha Narodnaha Śviata ŭ Kovienskim Litoŭskim Radyjo. Tam pierš byŭ adśpiavany bieł. nacyjanalny himn, a paśla byli pramovy ab Śviacie Biełarusaŭ u movach: litoŭskaj, biełaruskaj i francuskaj. Paśla byli deklamavanyja biełaruskija vieršy, vystupaŭ biełaruski chor pad kiraŭnictvam A. Matača i jhraŭ biełaruskija melodyi strunny arkiestr.

Uračysta śviatkavali 25 sakavik i Biełarusy na emihracyi ŭ Čechasłavaččynie i ŭ inšych krajoch.

29.III sioleta mieła adbycca ŭ Vilni publičnaje śviatkavańnie 18-tych uhodkaŭ abvieščańnia Niezaležnaści Biełarusi, ładžanaje Biełaruskim Nacyjanalnym Kamitetam. Na žal, jano nie zmahło adbycca z pryčyny zabarony administracyjnych uładaŭ. U hety adnak dzień a hadz. 9 u kaściele śv. Mikałaja ŭ Vilni adbyłosia nabaženstva, paśla jakoha Ks. Adam Stankievič skazaŭ kazańnie, paśviačanaje najvialikšym ideałam Biełaruskaha Narodu, vyražanym u Akcie 25 sakavika 1918 hodu. Paśla-ž nabaženstva, prysutnyja ŭ kaściele adśpiavali biełaruski relihijny himn: „Boža što kališ narody"...

Jak bačym, sioleta biełaruskaje hramadzianstva ŭ Vilni było pazbaŭlena mahčymaści publična, na adpaviednaj akademii, adśviatkavać uhodki abvieščańnia najvialikšaha biełaruskaha Aktu. Nichto adnak nia moža nikoha pazbavić mahčymaści adśviatkavać svajo śviata ŭ svajej dušy i ŭ svaim sercy, uzmacniajučysia ŭ hety dzień da dalejšaj pracy na karyść svajej Baćkaŭščyny... I kožny biełarus śviata heta ŭračysta ŭ dušy svajej adśviatkavaŭ. Adśviatkavała jaho i biełaruskaja moładź, katoraja navat znajšła sposab i mahčymaść zrabić heta publična, demanstracyjna... A moładź heta-ž budučynia, heta nadzieja i zaruka ździejśnieńnia i ažyciaŭleńnia Aktu 25.III.1918...

J. N.

Deklaracyja
pravoŭ maładoha pakaleńnia Polščy

U № 16 z dn. 20.III 36 časapisu „Poprostu" nadrukavany prajekt „Deklaracyi pravoŭ maładoha pakaleńnia Polščy". Pobač hetaha-ž prajektu, u tym-ža samym numary znachodzim artykuł vydaŭca časapisu „Poprostu" dr. H. Dembinskaha, katory, miž inšymi, padpisaŭ tak-ža ŭspomnieny prajekt deklaracyi. U artykule svaim dr. H. Dembinski, jak nia dziŭna, zvaročvajecca čamuści da biełaruskaje moładzi (deklaracyja-ž moładzi *Polščy*, navat nia Polskaje Dziaržavy) z zaklikam raspaŭsiudžvańnia henaha prajektu deklaracyi pa našych vioskach i padpisvańnia jaho.

Znajučy dr. H. Dembinskaha z jaho dasiulešnich radykalna-pastupovych vystupleńniaŭ i pomniačy niekatoryja zvaroty časapisu „Poprostu" adnosna Biełarusaŭ, zdavałasia, pa pračytańni artykułu dr. H. D ha, što ŭ deklaracyi henaj jość niešta novaje, šyrokaje, što niasie Biełarusam novyja horyzonty na budučyniu. Kali adnak dobra prahledzim deklaracyju, dyk pabačym, što tam ničoha padobnaha niama. Praŭda, u deklaracyi vyražanyja damahańni pracy dla moładzi, prava hołasu ad 21 hodu, svabody słova, sabrańnia, arhanizacyi, — i heta dobra: hetaha damahajucca ciapier usie, a navat niekatoryja sanatary. — Dalej, u deklaracyi vyražanyja damahańni: nadziełu ziamloj ad abšarnikaŭ, ale tolki tych, što zalahajuć z *apłataj padatkaŭ*; škoły ŭ baćkaŭskaj movie dziaciej — ale tolki 7-mi addziałovaj, pačatkavaj, a siaredniaja, znača pavinna być dla ŭsich u movie polskaj; nu i nareście „prava da svajej nacyjanalnaj kultury i da aŭtanomii tym narodam, katoryja zasialajuć *polskija* ziemli".

Deklaracyja heta jość da peŭnaj miery prahramaj. Dla Biełarusaŭ jana źjaŭlajecca jak-by abiacankaj. Kali paraŭniajem ciapier hetu abiacanku z abiacankami davanymi Biełarusam kaliś polskim „Odrodzeniem", „Wyzwoleńniem", roznymi «Partyjami i Stronnictvami Chłopskiemi», katoryja sulili Biełarusam kulturalnuju, a navat i terytoryjalnuju aŭtanomiju, dyk sapraŭdy «deklaracyja pravoŭ maładoha pakaleńnia» ŭ spravie biełaruskaj źjaŭlajecca nie progresam-postupam, a regresam-adstupleńniem.

Pierad usim, dla biełaruskaj moładzi nie da pryniaćcia źjaŭlajecca sam vuzki nazoŭ deklaracyi pravoŭ maładoha pakaleńnia P o l š č y. Damahańni ziamli taje, za katoruju nia płaciacca akuratna padatki — paprostu śmiešnaje. Skandalna pastaŭlena sprava školnaja, a damahańni prava nacyjanalnaje kultury i aŭtanomii narodam, katoryja zasialajuć *polskija ziemli*, pobač z zaklikam da biełaruskaj moładzi, kab jana dyskutavała nad hetym i padpisvała, vyhladajuć na niejki niasmačny žart, ci kpiny nad biełaruskaj moładździu. Bo-ž chiba viedama dr. H. Dembinskamu, što ziemli, na jakich žyvuć Biełarusy, pavodle hieohrafii i historyi majuć svoj sobski nazoŭ. Viedama chiba-ž

dr. H. Dembinskamu, što Biełarusy i biełaruskaja moładź imknucca da niezaležnaści, a znača, kali jznoŭ prajektadaŭcy deklaracyi chacieli, kab ichniuju deklaracyju padpisvała biełaruskaja moładź, musili-b niešta pazytyŭnaje skazać ab samaaznačeńni narodaŭ. Hetaha-ž niama. Dyk dumajem, što nia znojdziecca nichto z biełaruskaje moładzi, chto-b pavažna adnośsia da hetaj deklaracyi i jaje padpisvaŭ.

Niadaŭna Sud vydaviectva „Poprostu“ ŭstrymaŭ, heta,jasna, nie kasuje deklaracyi pravoŭ maładoha pakaleńnia. Aproč taho treba spadziavacca, što na miesca vyd. „Poprostu“ paŭstańnie novaje padobnaje vydaviectva, tak što ŭvažajem, što našyja ŭvahi adnosna deklaracyi maładoha pakaleńnia astajucca aktualnymi.

j. n.

Андрэй Чэмер.

На родным палетку*). [1]

I.

„Не прасі, ня гнісь ніколі
Траўкаю пахілай;
Сам пружыны сваёй долі
Выкуй ўласнай сілай!“
ЯКУБ КОЛАС.

Акінуўшы маркотным паглядам пакіданае места, Васіль вайшаў у вагон.

— Бывайце, мінулыя дні навукі, клопату і экзамінаў... Бывай, унівэрсытэт!...

Каманда, стукат шчэпленых вагонаў, і — места паволі зьнікнула з вачэй.

Аднастайна грукацяць колы: та-та-тах, та-та-тах, та-та-тах..., мігаюць тэлеграфныя слупы, дрэвы і загоны.

Маляўнічай стужкай раскідаюцца мястэчкі, пасёлкі й вёскі. Чыстыя, мураваныя, крытыя чарапіцай і бляхаю будынкі, дакладна і дбала дагледжаныя палі.

І зьяўляецца ў памяці Васіля другі абраз: нізкія драўляныя хаты, саламяныя стрэхі, цемната, нячыстата і нэндза... А паміж усяго гэтага забіты, цёмны беларус-селянін...

Балюча-бунтарная думка жалезным абручом сьціскае мозг Васіля:

— Калі ты, родная старана, прачнешся!? Калі твае сыны распачнуць сьмяротны бой з цемрай і горам за лепшую будучыню лапатнага народу?!...

— Няўжо Беларус і сапраўды горшы за другіх, няўжо

---

*) „На родным палетку“ — гэта апавяданьне А. Чэмера, прысланае на літаратурны конкурс „Шляху Моладзі,“ катораму конкурсовы суд прызнаў II-гую нагароду. Пачынаючы яго друкаваць, перад усім перапрашаем Пав. Аўтара, а так-жа і Пав. нашых Чытачоў, за папраўкі і апушчэньні, нават цэлых зваротаў, каторыя мы прымушаны зрабіць з прычын цэнзуральных. РЭДАКЦЫЯ.

не патрапіць уласнымі рукамі прабіць сабе дарогу да лепшага „заўтра“?

— Хто вінават, што наш народ церпіць столькі крыўды і гора, зьдзеку і нядолі??

— Церпіць цэлыя вякі, а калі перастане цярпець?

— Калі!!?...

Думаў Васіль і ў яго сьвядомасьці дасьпявала цьвёрдая пастанова рашучай барацьбы з несправядлівасьцю і зьдзекам, з гнётам нацыянальным і сацыяльным.

Так! Няма на каго спадзявацца, трэба самому брацца за працу. Пара!!...

* * *

Матчынай ласкай павеяла ад родных ніў, лясоў і сенажацяў, — ад убогіх сялянскіх стрэх, садоў і агародаў...

— Здароў, сынок! — абняў бацька Васіля. — Мы чакалі, чакалі ды думалі, мо' ўжо й ня прыедзеш...

— А дзе-ж мама? Ці ўсе здаровы? А Валя, Сёмка?...

Неўзабаве ўся сям'я вясёлым гоманам напоўніла хату. Пытаньні і адказы, сьмех і гумар бязупынна чарадаваліся між сабой...

Але трэба-ж агледзіць поле, ставок, сад ды ўсю гаспадарку (не дарма гаспадарскі сын!)...

Сколькі сьвежых і мінулых вобразаў!

Які вялікі вырас бярэзьнік, як пышна цьвіце сад?...

Вось тут ладзіў дудку, як пасьвіў статак, а там на прадвесьні запыняў ваду ды рабіў вазёры і грэблі са сьнегу. Там-жа, пад кустом лавіў сьліжы...

Аджылі дзіцячыя перажываньні і здарэньні, — простыя, наіўныя, але поўныя шчырасьці і запалу!...

* * *

Галасіста і разухабіста грае Ванё на гармоніку, хлопцы і дзяўчаты да ўпаду скачуць кадрыля і лявоніху.

Праз адчыненыя вокны ўліваецца чыстае вячэрняе паветра, відаць недасяжна-бязлікія зоры.

У куце, на канцы лавы, вядуць гутарку з Васілём зарэцкія хлапцы.

— Вось яшчэ пакуль была „Грамада“ — цягнуў Андрэй, — то неяк работа йшла, расло ўсьведамленьне, хлопцы ахватней браліся за ідэовую працу. Але цяпер?... Ізноў гульні, гарэлка ды дзеўкі... Няма каму, ды й няма кім пакіраваць...

— Тут не Запольле—падхапіў Сымон,—дзе ўся моладзь сьвядомая і дружна ладзіць грамадзкае жыцьцё. У нас кожны глядзіць абы сабе лепш, а агульная справа — чорт з ёю!...

— Можа выйдзем крыху на сьвежае паветра, — запрапанаваў Васіль, — тут столькі пылу!...

Праціснуліся праз натоўп гулякаў і глядзельнікаў ды каля жартуючых у сенях парак выйшлі на вуліцу.

Месяц лагодна-таёмнаю куляй завіс над гарачай зямлёй.

Недалёкі лес нявыразнымі контурамі ўразаўся ў цёмна-сіняе неба. Ціха шумелі дрэвы, з балота далятаў аднастайны крык драча...

Селі пад раскідзістай ліпай на лаўцы, закурылі.

— Кажаце ў нас не Запольле—пачаў Васіль — а чымжа мы горшыя ад запольцаў? Ці мы не такія самыя беларусы, як яны? Ці менш адукацыі маем? Не такія самыя сярмяжныя сыны беларускага селяніна?

—А чаму ў іх работа кіпіць, а ў нас з рук валіцца?— Бо ахвоты няма і ініцыятывы!

Выперадзілі яны нас і дзеля гэтага лягчэй ім удаецца кожная справа. Але ня думайце, што толькі яны патрапяць ладзіць спэктаклі, будаваць народны дом, тварыць бібліятэкі!

— Вось кажаце: народны дом, бібліятэку... Але дзе нам узяць грошай на такую рэч? Самі бачыце: галіта, на соль і газу няма, а заработкаў са сьвечкаю не знайсьці...

— О, на гэта можна знайсьці раду! Пэўна, калі будзем злажыўшы рукі чакаць на ласку з неба, то ніколі не дачакаемся народнага дому, ані бібліятэкі.

Але калі дружна возьмемся за арганізацыйную працу, заложым уласную арганізацыю, тады можна будзе наладзіць і спэктакль і зборку ахвяраў, і дрэва на народны дом. Але трэба ўсім дружна ўзяцца за работу.

У грамадзе сіла!

— Але хто возьмецца, — адазваўся Пятро — калі адзін другога цямней, як тая піўная бутэлька! Хіба вы, Васіль, дапамаглі-б нам, то можа што й выйшла-б. Усё-ж вучаны чалавек, то ня нам раўня, хутчэй усюды дарогу знайдзе.

— Я то з найвялікшай ахвотаю—падхапіў Васіль,—але мусіце мне даць слова, што дружна дапаможаце ў кожнай справе так перад сваімі, як перад чужымі?!

— Згода, за гэтым дзела ня стане!

Моцна пацiснулі рукі і вярнуліся назад на вечарыну.

* * *

Па ўсей ваколіцы разьняслася чутка, што зарэцкія хлапцы арганізуюць беларускі гурток, прадстаўленьне і думаюць будаваць народны дом...

Што нядзелю зьяўлялася моладзь з бліжэйшых вёсак паглядзець, як ідзе праца.

А было так: падалі заяву ў Галоўную Управу Таварыства Беларускае Школы аб легалізацыі гуртка, а тымчасам заняліся падрыхтоўкай памешканьня.

Удава Мар'я, сьвядомая кабета, аддала канец свайго дому бясплатна, на неагранічаны час.

Хата прасторная, можна ладзіць вечарыны, спэктаклі і усё, што запатрэбіцца.

Упарадкаваньне хаты для нашых хлапцоў было спра-

вай некалькіх дзён. Знайшліся й сталяры, і муляры, і артысты!...

Неўзабаве атынкавалі сьцены, пераламжылі ды выбелілі столь, зрабілі шафу на кніжкі й газэты, вымалявалі Пагоню... І усё гэта раніцамі ды вечарамі, скончыўшы сваю дзянную працу!...

Нават старыя зацікавіліся.

— Вось, кажуць, заўзяліся нашыя хлапцы! Адно невядома, што паліцыя на гэта скажа. .

Прыйдуць дзядзькі, паглядзяць, парадзяць дзе што лепш зрабіць.

— Рабеце, рабеце, кажуць, а калі трэба будзе, то й мы паможам!

Праўду кажучы, ня ўсе так спагадліва аднясьліся да пачынаў моладзі. Знайшліся і такія як Зьмітрук Каратай, якія, як вараньнё, пачалі каркаць:

— На чорта вам гэтая работа! Захацелася лезьці паляком напоперак... Глядзелі-б лепш гаспадаркі, работнікі якія!... І так з гэтага нічога ня будзе. От, Мані хату паправіце, а яна вам хвігу за гэта выставіць!

Але Васіль хутка даваў адпор гэтакім дабрадзеям.

— Ня вашае, дзядзька, дзела — казаў ён. Што нам трэба, тое й робім; ці з нашае працы што будзе, ці не — вашай помачы прасіць ня будзем! Не разумееце што да чаго, то й маўчэце!

Пасьля такога адказу стары хрэн мармычучы йшоў сваею дарогай.

* * *

Яшчэ праца каля народнага дому не дабегла да канца, як заняліся падрыхтоўкай спэктаклю.

Пастанавілі адыйграць „На папасе“ і „Мікітаў Лапаць.“

Два-тры разы на тыдзень адбываліся пробы, а на заканчэньне дзянной працы разьлягаліся зычныя гукі гармоніка, скрыпкі ці балалайкі, будзячы нявыразную радасьць і тугу на нечым нязнаным, далёкім...

— Ну, штож, пытаў Васіль, ці так трудна йдзе работа?

— Э, дзе там, — цешыліся поўныя запалу хлапцы, — каб хоць ўсё так добра йшло, як гэтая праца!..

Бачачы паважныя вынікі свае працы, зарэцкая моладзь сапраўды мела падставу ганарыцца перад іншымі вёскамі сваімі дасягненьнямі.

— Яшчэ толькі Запольле папераджае нас, казалі хлапцы, але як папрацуем год, два, то ніхто з намі не зраўняецца!

Вячэрнія курсы самаасьветы, гімнастычная сэкцыя, аркестра, хор, рад'ё, электрыфікацыя вёскі ды маса іншых праектаў была высунута на першы плян дзейнасьці гуртка.

Але тымчасам трэба было наладзіць прадстаўленьне.

(д. б.).

Вечар беларускай паэзіі і песьні

Дзень 15 сакавіка 1936 году ў жыцьці беларускіх маладых паэтаў у сучаснай Польшчы быў ня звычайным. У гэты дзень маладыя нашыя паэты ў залі прастарага будынку Віленскага Унівэрсытэту станавіліся перад беларускім грамадзянства і асабіста паказвалі яму свае лепшыя творы, падлічваючы гэтак білянс свае творчасьці.

Вечар беларускае паэзіі, вечар беларускае літаратуры— ў звычайным і нармальны бегу жыцьця — гэта нічога надзвычайнага. Але ці-ж сучаснае беларускае жыцьцё можа быць названа звычайным, нармальным? — Нам трудна цяпер сабрацца, нам цяжка штось зрабіць... Дзеля гэтага і падход да рэдкага ў нас вечару беларускае, ды яшчэ маладое, паэзіі ня звычайны штодзенны, а сьвяточны. Тымбольш, што вечар быў сьвяточным ня толькі для нашых маладых песьняроў, але да пэўнай меры і для нас—„Шляху Моладзі", бо-ж усе бадай паэты (за выняткам Н. Арсеньневай), якія прыймалі ўдзел у вечары, у той ці іншай меры мелі і маюць лучнасьць з „Шляхам Моладзі".

Быў вечар. Заля Сьнядэцкіх Віленскага Унівэрсытэту ярка асьвечана і па берагі выпаўнена публікай. З-за вішнёва-залацістае, катэдры з-пад бела-чырвона-белых нацыянальна-беларускіх сьцягоў і „Пагоні" плывуць громкія словы мгр. Ст. Станкевіча аб маладой беларускай паэзіі. Спачатку лектар гаворыць аб беларускай паэзіі агулам, пасьля аб бел. паэзіі ў Радавай Беларусі, якая быстра разрастаецца і пераходзіць да маладое паэзіі беларускай у сучаснай Польшчы, затрымліваючыся над галоўнымі прадстаўнікамі яе, каторыя за хвіліну зьяўляюцца на сцэну.

Міхась Машара — наш слаўны Міхась. Хто яго цяпер ня знае. Ён сяньня першы пачынае паход маладняку. Ён сяньня цешыцца сярод шырокіх бел. грамадзкіх кругоў найбольшай папулярнасьцю. Міхась Машара, сялянскі сын з Дзісьненскага павету, з мазалямі на руках, а з агнём і з чулай душой у грудзях — гэта вялікі талент і перадавік маладой беларускай паэзіі. Ягоная творчасьць гэта неправаны магутны гімн новай, маладой Беларусі, якую паэт прадстаўляе рэальным фактам і гістарычнай канешнасьцю, і пераход якой ён абвяшчае ў сваіх вершах. Гэта ёсьць яго пераканаНьне і з гэтага пераканаНьня паэт чэрпае творчыя сілы і, ня гледзячы на нязвычайна цяжкое сваё асабістае жыцьцё, зьяўляецца вялікім оптымістам і так часта пяе аб „сьветлай", „сонечнай" будучыні, аб адраджэньні і перамозе. Творы ягоныя адзначаюцца глыбокім лірызмам, дынамікай, магутнай бадзёрасьцю побач з мяккай пачуцёвасьцю, якую знаходзім у вершах асабістых і прыродаапісальнага харак-

тару, а так жа вялікай сілай экспрэсіі, мілагучнасьцяй і музыкальнасьцяй. Дасюль Машара мае ўжо выданых 7 кніжыц і шмат твораў раскіданых па розных бел. часапісах. Міхась Машара зьяўляецца сталым і перадавым супрацоўнікам „Шляху Моладзі“, а так жа іншых часапісаў.

Паяўленьне на сцэне М. Машары прысутныя на залі прынялі бурай воплескаў, якія яшчэ больш узмагліся пасьля прачытаньня ім некалькіх вершаў. Пасьля выступленьня паэта, ягоныя творы дэклямавалі йшчэ дэкляматары студэнты. Воплескам і бравам здавалася і канца ня будзе.—Падобна горача былі спатыканы і прыйманы выступленьні і дэклямацыі твораў Васілька, Ільяшэвіча і Танка.

Міхась Васілёк — селянін з Горадзеншчыны. Ягоную творчасьць мгр. Ст. Станкевіч дзеліць на два пэрыяды. Першы, які абняў зборнік яго вершаў „Шум баравы“, выданы ў 1929 годзе, разьвіваўся пад уплывам „нашаніўскай“ паэзіі і да гэтага пэрыяду вельмі добра тасуецца псэўдонім паэта „Васілёк“ — прыгожая краска беларускіх палёў, а другі, сучасны пэрыяд творчасьці Васілька прыняў характар соцыцыяльны і зьвініць пратэстам супроць соцыяльнае несправядлівасьці. З апошнімі вершамі М. Васілька чытачы нашы маглі пазнаёміцца з бачын „Шляху Моладзі“.

Максім Танк — на беларускім літаратурным горызонце паявіўся нядаўна. Паходзіць з Пастаўскага пав. Малады яшчэ, цяпер прабывае ў Вільні. Зьяўляецца ён паэтам пачынаючым, але вялікіх здольнасьцяў, а ягоная творчасьць, якая ў большасьці ляжыць яшчэ ў рукапісах, мае высокую мастацкую вартасьць. Галоўнай ідэолёгічнай рысай творчасьці Танка ёсьць выказваньне соцыяльнай несправядлівасьці беларускага селяніна і работніка, а жыцьцё іх зьяўляецца ў пераважнай меры тэматыкай твораў паэты. Старую форму вершаў ён закінуў і з добрым вынікам застасоўвае новы рытм, канструкцыю верша і яго стыль, якія ў вялікай меры зьяўляюцца ў яго арыгінальнымі. Пішучы аб М. Танку не бяз гонару можам пахваліцца, што „Шлях Моладзі“, зьяўляецца адным з першых часапісаў, з якога бачын шырэйшыя бел. кругі маглі, хоць часткова, зазнаёміцца ўжо з яго вершамі.

У творчасьці Танка, падобна як у Машары і Васілька, пераважаюць матывы грамадзкія; у паэтаў-жа, аб якіх будзем пісаць ніжэй, мамэнт гэты ўступае месца матывам іншым.

Анатоль Бярозка — ведамы нашым чытачом з бачын „Шляху Моладзі“ ад некалькіх ўжо гадоў сваімі прыгожымі мастацкімі вершамі. Малады гэты паэт мае бязумоўна вялікі талент, які знаходзіцца ў стадыі шырокага развою. Вершы ягоныя адзначаюцца глыбокай настраёвасьцю і псыхолёгізмам, з гледзішча тэхнічнага зьяўляюцца беззаганнымі.

А. Бярозка — студэнт мэдыцыны Віленскага Унівэрсытэту, родам з Баранавіцкага павету. Чалавек нязвычайнай

дабрадушнасьці і скромнасьці. На літаратурным вечары сам асабіста ня выступаў і нават не паказаўся на сцэну, хоць прысутныя выклікалі яго і чакалі. Творы ягоныя дэклямавалі дэкляматары. Да лектара грам. Ст. Ст. можна мець прэтэнсію, што А. Бярозцы, у параўнаньні з іншымі і адносна ягонага таленту ў сваім рэфэраце, замала пасьвяціў увагі.

Натальля Арсеньнева — займае асобнае месца ў беларускай літаратуры. Яе творчасьць мгр. Ст. Станкевіч дзеліць на дзьве групы: першая, гэта пераважна дробныя лірычныя вершы, асабістага й прыродаапісальнага характару, насычаныя суб'ектывізмам аўторкі, каторыя, дзякуючы мяккай пачуцьцёвасьці, яркім кантрастам абразоў і настрояў прагарваюць жыва да чытача. І другая група, якая абыймае творы аснованыя на фольклёрыстычным матар'яле, у якіх Арсеньнева арыгінальным спосабам карыстае з народнае творчасьці.

Н. Арсеньнева жыве цяпер на польскім Памор'і і асабіста ўчасьця ў літ. вечары ня прыймала. З яе творамі можна пазнаёміцца з яе зборніку вершаў „Пад сінім небам" і з літаратурна-навуковага часапісу „Калосьсе", у якім супрацоўнічае і каторы агулам рэпрэзэнтуе ў Вільні беларускую літаратуру і навуку. — Арсеньневу фактычна можна залічыць да старэйшае генэрацыі беларускіх паэтаў.

Хведар Ільяшэвіч — родам з Пружаншчыны, у мінулым годзе кончыў Віленскі Унівэрсытэт і цяпер працуе як вучыцель беларускае мовы ў Віл. Бел. Гімназіі. З ягонай творчасьцю чытачы нашы маглі часткова пазнаёміцца з бачын „Шл. Моладзі" на якіх ня раз гасьціў. Галоўнай асаблівасьцю твораў Ільяшэвіча ёсьць вобразнасьць. Гэта рыса ў яго вельмі характэрная ў сувязі з тым, што ён, падобна як і Танк, парваў з старой формай верша і перадае свае абразы ня спосабам падробнага эпіцкага апісаньня, але пры помачы мэтафараў (пераноснага значэньня). Тэматыкай вершаў Ільяшэвіча зьяўляецца места. Дасюль мае ён выданых два зборнікі вершаў: „Веснапесьні" і „Зорным шляхам". Хв Ільяшэвіч піша так-жа прозай. Прозай пішуць яшчэ і Машара, Танк і Васілёк.

Вечар зьбліжаўся да канца. З сцэны нясьліся мілагучныя тоны беларускае песьні ў мастацкім выкананьні салістаў і хору пад кіраўніцтвам грам. Шырмы. Уражаньні, настрой—радасныя і мілыя, бо-ж вечар паказаў, што маладая беларуская паэзія стаіць высока і памысна разьвіваецца. Але былі аднак і недахопы, ды нават жаль да лектара, чаму ён абмежаваўся толькі да названых вышэй шасьцёх, праўда перадавых паэтаў, а нічога ня ўспомніў аб іншых бел. маладых паэтах, як аб *Вількоўшчыку, Казлоўшчыку, Жуку, Жальбе, Грышкевічу, Бураломе, М. Дубку* і цэлай плеядзе іншых, менш знаных, ціхіх песьнярох нашай вёскі, каторыя ўсё ж-такі на гэта заслугоўвалі?

На заканчэньне вечару хор прасьпяваў вершы: „Касец"— Танка, „Вясна" — Васілька і „Марш маладых" — Машары, да якіх музыку ўлажыў праф. К. Галкоўскі. Пасьля прысутныя адсьпявалі бел. рэвалюцыйны гімн: „Ад веку мы спалі"...

Вечар адбыўся. Ажывіў ён нашае жыцьцё, даў магчымасьць хоць некаторым нашым паэтам саткнуцца беспасярэдне з беларускім грамадзянствам. За гэта арганізатарам вечару — беларускім студэнтам і ўсім актыўным учасьнікам яго чэсьць і слава!

Цяпер варта было-б падумаць, каб наладзіць літаратурны вечар, на якім маглі б выступіць старэйшыя беларускія паэты, як Быліна, Адважны, Краўцоў М., Леўчык, Улад-Ініцкі, ці дзе прынамсі дэклямаваліся-б іх творы.

Цёмнай і марознай прадвясьнянай ночкай высыпалася грамада беларусаў з унівэрсытэцкіх муроў. У душах іх поўна было гарачых адраджэнскіх напеваў беларускага маладняку.

Места спала. Дзе-ня дзе гарэлі яркім сьвятлом электрычныя лямпы, кідаючы ў цемру снапы сьвятла. Грамада беларусаў рассыпалася. Кожны йшоў у іншую старану, у іншую вуліцу. Кожны нёс у сэрцы перакананьне, што жыве Беларусь і што жыць будзе...

Я. Н.

Максім Танк

А ўсё-ж вярнуся...

(Верш чытаны на літ. вечары 15.III.36).

А ўсё-ж вярнуся я к табе,
плугом узораная ніва,
і песьні новыя сяўбе
сьпяю ў зялёных пералівах.

І прывітаю новы дзень,
як першы ледаход на рэчцы
і песьня нібы лятуцень
заплача шчасьцем на жалейцы.

І полем новым я пайду.
Напеў забыты вецер сьвішча
і гоніць мокрую зару
на медна-горкае іржышча.

Із цёплым шчасьцем у грудзёх
спаткаю, вёска, тваю восень
пад скрып разбуджаных дарог,
пад шум разбуджаных калосьсяў.

Ляжыць дарога сотні міль,
а вецер неба сінь расплёскаў
і сініць дзень заўтрашні і быль
мая саломенная вёска.

Мо пад дзіраваю страхой
прыпомніць месяц белабокі
матулі згорбленай, старой
блізкіх знаёмых і далёкіх...

Вярнуся ў вёску пад вясну
іграць над рэчкай ў вербалозе
і небыліц шмат раскажу
знаёмым, полю і бярозам.

Вільня, 14.III.36.

SIOLETNI „KAZIUK“ U VILNI

Kožny hod u Vilni 4 sakavika, heta znača ŭ dzień św. Kazimiera, adbyvajucca vialikija tradycyjnyja kirmašy, popularna zvanyja „Kaziukom“. Sioletni „Kaziuk“ adbyŭsia z vialikaj „pompaj“. Pryjaždžała na jaho mnoha ludziej z roznych staron i navat filmovaja (kinovaja) ekspedycyja „Ufa“ z Niamieččyny, katoraja zdymała na filmovuju stužku ŭvieś kirmaš. U hety-ž

Kaziukovy pachod na vul. Mickieviča (ŭhary vidać katedra).

dzień byŭ naładžany reklamovy pachod pa vulicach miesta Vilni, katory častkova vidać na padanaj vyšej ilustracyi. U pachodzie hetym brała ŭdzieł na specyjalna prybranym vozie z nadpisam: *„Прывітаньне Вясьне!“* biełaruskaja vučnioŭskaja moładź, katoraja jeduči śpiavała biełaruskija pieśni, źbirajučy hučnyja vopleski, i kataraj voz byŭ vyraźnieny arhanizatarami pachodu — „T-wem Propagandy Turystyki“ — jak pieršy. Dalej byli vyraźnieny vazy polskich škoł i roznych ustanoŭ.

Za dobraje vykarystańnie mamentu dzieła reklamy bieł. pieśni i ahułam biełaruskaści, vučnioŭskaj biełaruskaj moładzi należycca pachvała.

U BIEŁ. STUDENTAŬ

— 16 sakavika sioleta adbyŭsia ahulny hadavy schod „T-va Pryjacielaŭ Biełarusaviedy“ pry Vilenskim Universytecie, na jakim, paśla spravazdačy ŭstupajučaha ŭradu z dziejnaści T-va za minuły hod, vybrany novy ŭrad T-va ŭ nastupnym składzie: staršynia — St. Naruševič, siabry ŭradu: M. Kancelarčyk, A. Machońka, A. Katkavičanka i I. Budźčanka i zastupniki A. Dasiukievič i A. Smarščok.

— 17.III siol. u BSS staršynia BSS stud. M. Ščors čytaŭ lekcyju ab biełaruskim školnictvie i zaklikaŭ biełaruskich studentaŭ da pravodžańnia akcyi damahańnia bieł. dziarž. školaŭ.

— 18 sakavika siol. Biełaruski Studencki Sajuz ładziŭ dyskusyjny viečar na temu „Biełaruskaja sprava i časapis „Poprostu“. Viečar pačaŭ karotkim referatam stud. Baranavič. Paśla zabirali hałasy i inšyja studenty, a tak-ža i starejšyja hramadzianie, hości, a miž imi i vydaviec čas. „Poprostu“ dr. H. Dembinski. Jak viedama, časapis „Poprostu“ paśviačaŭ niejki čas davoli šmat miesca biełaruskaj spravie i šmat kaho z biełarusaŭ da siabie pryciahnuŭ. Apošnim časam „Poprostu“ čamuści mienš paśviačaje Biełarusam miesca, a dyskusija 18.III ŭ BSS vyjaviła, što vialikaja čaść bieł. hramadzianstva da čas. „Poprostu“ zajmaje stanovišča pasyŭnaje, a často nehatyŭnaje, nia bačačy vyraznaha stanovišča čas. „Poprostu“ da Biełarusaŭ.

SUDY

— Ad 23 da 30 sakavika sioleta ŭ Vilenskim Akružnym Sudzie adbyvaŭsia vialiki palityčny praces 16 asob, bolšaść katorych hurtavałasia kala „Бел. Газэты“, „Літ. Старонкі“ i „Асвы“. Usie jany abvinavačanyja byli ŭ kamuniźmie. U vyniku ž sudu pakarany vastroham na 8 hadoŭ — vydaviec i red. „Bieł. Hazety“ inž. A. Karpovič, J. Miska i V. Taŭłaj; na 6 h. — red. „Lit. Staronki“ J. Patapovič, red. „Asvy“ P. Radziuk, J. Piestrak, A. Budnik i A. Potažnik; na 4 h.: D. Madejskier i Redźka; na 3 h.: T. i Ł. Budzinovičy i P. Kryštapanis; na 2 hady — S. Višnieŭskaja. Abvinavačanaha Cimafiejeva sud pryznaŭ niavinavatym, a 16 abvinavačanaha, małaletniaha Budovniča pakaraŭ papraŭčym domam, ustrymlivajučy hetu karu. Apráča hetaha ŭsie zasudžanyja pazbaŭlenyja publičnych i hramadzkich pravoŭ ad 5 da 8 hod, na padstavie-ž amnestyi kara vastrohu ŭsim častkova źmienšana. Pakaranyja padali apelacyju.

Treba adznačyć, što Piestrak (Źviastun), Patapovič, Taŭłaj i Redźka źjaŭlajucca maładymi pačynajučymi biełaruskimi paetami.

— Niadaŭna ŭ hetym-ža Vil. Akruž. Sudzie adbyvaŭsia inšy palityčny praces, u časie jakoha zasudžana była na 6 hadoŭ vastrohu maładaja biełaruska L. Atrachimavičanka, jakuju prakuror askaržaŭ u kamuniźmie.

CHRONIKA

Z biełaruskaha žyćcia

Z dziejnaści Vil. Addziełu BIHiK. U m-cy sakaviku sioleta Vilenski Addzieł Biełaruskaha Instytutu Hasp. i Kultury dalej ładziŭ kožnuju niadzielu lekcyi z cyklu biełaruskaje historyi, katoryja čytaŭ Ks. V. Hadleŭski. I tak: 8.III adbyłasia lekcyja na temu: „Tvareńnie Vialikaha Kniastva Litoŭskaha i Biełaruś"; 15.III—„Unija Vialikaha Kniastva Litoŭskaha z Polščaj". Na lekcyi hetaj byŭ paet Michaś Mašara, jakoha prysutnyja na lekcyi horača pryvitali. U adkaz-ža na pryvitańnie M. Mašara vyraziŭ padziaku i pračytaŭ adnu zvarotku svajho vierša, charaktaryzujučuju siańniašniaje ciažkaje pałažeńnie Biełaruskaha narodu. — 22.III adbyłasia lekcyja na temu: „Bieraściejskaja relihijnaja unija 1596 hodu". Zacikaŭleńnie lekcyjami było vialikaje i ludziej na ich było mnoha.

„Wiadomości Białoruskie". Pad hetkim nazovam 10.III.36 pačaŭ vychodzić biuleteń Biełaruskaha Nacyjanalnaha Kamitetu, vydavany šapirohrafnym sposabam u polskaj movie. Biuleteń hety praznačany dla padavańnia viestak ab biełaruskim žyćci ŭ polskija i inšyja hazety. Charaktar jahony informacyjny. Vydaje i redahuje biuleteń ad imia BNK-tu inž. A. Klimovič. Adras „Wiadomości Białoruskich" (WB): Wilno — Zavalnaja 1.

Kanfiskaty. 8.III sioleta vilenskija administracyjnyja ŭłady skanfiskavali № 11 „Bieł. Krynicy", 25.III tyja-ž ułady skanfiskavali № 3 „Новага Шляху", 27.III jznoŭ № 14 „B. Krynicy", a 5.IV niadaŭna vydanuju knižku dr. St. Hrynkieviča p n. „Aświeta".

Pasiedžańnie Bieł. Navukovaha T-va. U čest 450-tych uhodkaŭ naradzinaŭ pieršaha biełaruskaha drukara doktara Fr. Skaryny, 8 III sioleta ŭ Vilni adbyłosia ŭračystaje pasiedžańnie Bieł. Navukovaha T-va ŭ časie jakoha A. Łuckievič i dr. J. Stankievič čytali referaty ab Skarynie i movie jahonych drukaŭ. Na hetym pasiedžańni pastanoŭlena było damahacca ad uładaŭ m. Vilni pieraimienavać Vialikuju vulicu na vulicu im. Fr. Skaryny.

Jak heta nazvać? 2-ha krasavika sioleta dyrektar Biełaruskaj Filii dziaržaŭnaj himnazii im. J. Słavackaha ŭ Vilni R. Astroŭski zrabiŭ reviziju ŭ vučniaŭ hetaje himnazii i paadbiraŭ ad ich deklaracyi i zajavy patrebnyja pry damahańni biełaruskaje školy, katoryja vučni chacieli zaviašci svaim baćkom dy susiedziam na viosku, kab tyja mahli vypaŭnić svoj biełaruski abaviazak, damahajučysia rodnaje školy. Pry hetym dyr. R. Astroŭski sroha ŭsim vučniam zabaraniŭ na dalej padobnyja druki brać i vazić na viosku. — Kali voźmiem pad uvahu, što druki henyja lehalnyja i praznačanyja na damahańnie rodnaj **biełaruskaj škoły** i što dahetul jašče navat niaviedamyja nam vypadki, kab palicyja ad kaho-niebudź ich zabirała, dy što R. Astroŭski choča, kab jaho ŭvažali i sam siabie ŭvažaje za bieł. dziejača, dyk treba śćvierdzić, što pastupak R. Astroŭskaha niahodny biełarusa i zasłuhoŭvaje na hańbu.

З ВЫДАВЕЦКАЙ НІВЫ

„Інструкцыя, як дамагацца дзяржаўнай публічнай беларускай школы“. Выданьне: Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры і Т-ва Бел. Школы. Вільня 1936. Бач. 15. Фарм 8⁰.

Кніжыца гэта зьмяшчае дэкларацыю і адозву БІГіК і ТБШ у школьнай справе з заклікам, каб бацькі-Беларусы і апякуны беларускіх дзетак дамагаліся дзяржаўных беларускіх школаў, падаючы ў гэтай справе дэкларацыі школьным уладам, а так-жа інструкцыю і выпіску з закону важнейшых артыкулаў аб арганізацыі беларускага школьніцтва. Падае інструкцыя так-жа практычныя рады, як дамагацца беларускае школы і ўзоры заяваў ды дэкларацыяў, патрэбных пры дамаганьні роднае школы. Інструкцыя гэта сапраўды дужа патрэбная і якраз зьявілася ў пару. Ёй павінна зацікавіцца ўсё беларускае грамадзянства, а асабліва моладзь, узяць яе зьмест глыбака да сэрца ды прыступіць да працы. — Інструкцыю, а так-жа фармуляры дэкларацыяў і заяваў патрэбныя пры дамаганьні бел. школы, на жаданьне высылае дарма Школьны Сакратар'ят, адрас якога—Вільня, Каралеўская 3—8.

„Летапіс ТБШ“ № 1-3 за студзень-люты-сакавік 1936 г. Год выд. II. Бач. 28. Фарм. 8⁰. Цана нумару 35 гр.

Гэты культурна-грамадзкі і літаратурны месячнік зьяўляецца органам ТБШ. Пачаў ён выходзіць у 1933 г. № 1-3 „Летапісу“ за бягучы год выйшаў пасьля доўгага перарыву; пасьвячаны ён пераважна справе беларускай школы, якая ў сучасны мамэнт асабліва актуальная.

Дакторская праца мгр. Ст. Станкевіча. Нядаўна выйшла з друку дысэртацыйная праца мгр. Ст. Станкевіча п. н. „*Pierwiastki białoruskie w polskiej poezji romantycznej*“. Кніжка фармату 8⁰ абымае 320 бачын. Выдала яе ў польскай мове Т-ва Навуковае Помачы ім. Э. Э. Врублеўскіх. Выданьне кніжкі саліднае, зьмест багаты і цікавы. Цана 6 зл. **Я—к.**

Яйко вучыць курыцу. 14.III сёлета ў Вільні выйшаў новы літаратурна-грамадзка-навуковы часапіс п. н. „*Маладая Беларусь*“. Вонкавы выгляд гэтага часапісу ў значнай меры ёсьць копіяй ведамага часапісу „Калосьсе“, а зьмест вельмі „размавіты“. Прыгожае пісьменства рэпрэзэнтуюць творы Машары, Васілька, Танка, Ільяшэвіча, а так-жа творы паэтаў з БССР. На сколькі літаратурны аддзел робіць добрае ўражаньне, настолькі артыкулы грамадзкага зьместу — благое. Перад усім рэдакцыя часапісу маладых, як яго называюць ягоныя рэдактары, у сваім уступным слове, замест выказаць сваю праграму, свае новыя думкі, пачала навучаць старэйшае грамадзянства і нэгаваць яго працу. Гэта ёсьць

Рэдагуе Калегія.
Выдаюць: Я. Багдановіч і А. Шутовіч. Рэдактар Я. Найдзюк.

найсумнейшае зьявішча ў нас, што яшчэ „не адрос ад бацькавых калош, а розуму „набраўся".

З „навукова-грамадзкіх" працаў асабліва вырожніваецца сваім тонам публіцыстычны артыкул В. Грышкевіча, у якім аўтор падважывае пазытыўныя культурныя здабыткі беларускага народу.

Супроць гэтакага тону „Мал. Беларусі" публічна зарэагавалі яе супрацоўнікі паэты Танк і Васілёк. Пасьля гэтага будучыня „Мал. Бел." стала вельмі няпэўнай.

Др. Я. М.

VIALIKAJA PAVODKA Ŭ AMERYCY



Zalityja vadoj abšary ŭ Amerycy i vyviernuty ciahnik.

U m-cy sakaviku Zł. Štaty Paŭnoč. Ameryki naviedała strašnaja pavodka Vada, jakaja vyjšła z bierahoŭ reki Ohio, zaliła vialikija abšary, znosiačy darohi, budynki i ahułam niščačy ŭsio. U vyniku henaje pavodki zhinuła kala 200 asob, a 429 tysiač asob astałosia biez strachi nad hałavoj. Straty ad hetaj pavodabličajuć na 507 miljonaŭ dalaraŭ.

USIAČYNA

— Na Paleśsi panuje štrašennaja biednata, hoład i navat šyrycca tyfus. Miascovyja biełaruskija i ukrainskija palašuki patrabujuć skoraj i pasilnaj pomačy, z jakoj u mieru mahčymaściaŭ pavinny ŭsie im paśpiašyć. Achviary źbirajuć adumysłovyja kamitety, a tak-ža redakcyi niekatorych hazet.

— Polskaje Statystyčnaje Biuro padaje, što ŭ praciahu troch apošnich miesiacaŭ minułaha hodu ŭ Polščy było 407 rabotnickich strajkaŭ, katoryja achaplali 1908 pradpryjemstvaŭ. Treba skazać, što chvala strajkaŭ u Polščy sioleta ŭzmahłasia i ŭ časie niekatorych strajkaŭ dachodziła da vialikich zabureńniaŭ. Tak napr.: 23 sakavika miž strajkujučymi rabotnikami i palicyjaj u Krakavie dajšło da aružnaje sutyčki, u vyniku katoraje akazałasia 6 rabotnikaŭ zabitych i 30 ranienych. Niadaŭna byŭ tak-ža vialiki strajk u Lidzie, Niomnie i inšych fabryčnych miestach našaha kraju. Apošnim časam adbyvajucca tak-ža ŭ Polščy vielmi časta antyžydoŭskija demanstracyi.

— Italijanskaje vojska ŭ Abisynii z kožnym dniom što-raz bolšyja zajmaje abšary, mocna pry hetym bjeć słaba ŭzbrojenaje abisynskaje vojska, katoraje mužna j zaŭziata baronicca.

— 29-ha sakavika sioleta ŭ Niamieččynie adbylisia vybary ŭ parlamant, pavodle jakoha za Hitleram staić 99 prac. usiaho nasielnictva; bo na jaho hałasavała 44.389.146 asob, a prociŭ 542.898. Z hetaha bačym, što Hitler maje zadziŭlajuča vialiki davier u svaim narodzie i što hetym narod niamiecki paćvierdziŭ jahonuju sučasnuju palityku. Cikava tolki, ci kožny niamiecki hramadzianin mieŭ svabodu ŭ vyjaŭleńni svajho pahladu.

— Na Dalokim Uschodzie niespakojna. Apošnim časam tam vielmi časta na hranicy Mandžuryi i Manholii adbyvajucca aružnyja sutyčki miž vojskami savieckim i japonskim.

PAŠTOVAJA SKRYNKA

Usich našych Pavažanych Supracoŭnikaŭ, jakich matarjały abiacali my nadrukavać u hetym № 3 „Šl. Moładzi" vietliva pieraprašajem, što z pryčyny navału aktualnych matarjałaŭ, hetaha nie zmahli zrabić. Abiacańnia-ž svajho datrymajem u nastupnym № 4 „Šl. Ml."

Pavaž. Ajcu A. Kaŭšu: Za prysłanuju padpisku i vierš Z. K., jaki budziem staracca nadrukavać u nastupnym numary, ščyra dziakujem.

Viarbinie: Padručnika, jak pisać vieršy, biełaruskaha niama. Krytyku na Vašy vieršy vyšlem Vam piśmom.

A. Śpirydoviču, J. Kukałoviču i Marku: Vieršy słabavatyja i da druku nie padchodziać. Radzim paprabavać pisać prozaj.

P. Hranitu, Maładomu Dubku, M. Listu, Dniaprovu: Z daručanych nam vieršaŭ u mieru mahčymaściaŭ budziem karystać u nastupnych numaroch „Šl. Mol." Prosim pisać.

A. Stapčuku: Vierš słaby i bolš Vam radzim ich nia pisać. Karespandencyju ab žyćci na vioscy nadrukujem.

Hučnamu: Karespandencyju pastarajemsia nadrukavać, ale dziela taho što Vy nie padpisvajecie jaje praŭdzivym proźviščam, a praŭdzivaści padanych faktaŭ my nia možam sami śćvierdzić, dyk budziem zmušany jaje krychu źmiakčyć, bo kali my jaje tak nadrukujem, to ŭsia heta sprava moža apynucca ŭ sudzie i my, nia majučy śviedkaŭ, jaje prajhrajem.

J. Łuhavomu i N. K—ko: Dziakujem nadrukujem. Pryvitańnie!

T. Hutor: Za prysłanyja matarjały ščyraja padziaka, u mieru mahčymaściaŭ budziem z ich karystać.

J. Bahunu: Prysłanaha artykułu, na žal, vykarystać nia možam z pryčyn cezuralnych.

Usim, chto prasiŭ prysyłać „Šlach Moładzi" prośba spoŭniena. Čakajem na padpisku.